**Гаўрына Л.М.,** *дацэнт*

# ФАЛЬКЛОР ЯК АСНОВА МУЗЫЧНАГА МАСТАЦТВА

Яшчэ задоўга да таго, як з'явіліся шэдэўры музычнай і літаратурнай класікі, народ стварыў бессмяротныя быліны, сагі, казкі, песні. Народная творчасць была асновай і для літаратуры, і для музыкі.

Вядомыя кампазітары розных краін неаднаразова адзначалі залежнасць іх мастацтва ад народных вытокаў. У музыцы цесная сувязь прафесійнага мастацтва з народнымі вытокамі больш відавочная, чым у іншых відах мастацтва. Меладычнае багацце класічнай музыкі, яе ладавы строй, тэмбравыя і кампазіцыйныя традыцыі - усё гэта выйшла з народных вытокаў. Вялікія скарбы музычнага фальклору, назапашаныя чалавецтвам за многія стагоддзі яго гісторыі, песні і інструментальныя найгрышы ёсць ва ўсіх народаў зямлі. Няма такога народа, нават самага маленькага, які б не меў свайго песеннага фальклору, надзвычай самабытнага і непаўторнага. Народныя песні вельмі разнастайныя па сваёй тэматыцы. Гэта абрадавыя, гістарычныя, лірычныя, бытавыя і інш. Песні звязаны з пэўнымі падзеямі ў жыцці народа. У рытуальных абрадавых песнях людзі выказалі свае мары аб багатым ураджаі, шчаслівым паляванні, аб лепшым жыцці (калядкі, вяснянкі, купальскія песні). Да абрадавых належаць галашэнні, вясельныя песні.

Шмат у розных народаў песень аб працы (напрыклад, песні бурлакоў, земляробаў і інш.). Вельмі разнастайныя песні пра сялянскі быт. Гэта калыханкі, карагодныя, гульнявыя, любоўныя песні, песні аб цяжкім жаночым лёсе.

Імкненне да незалежнасці, волі знайшло адлюстраванне ў разбойніцкіх, рэкруцкіх, паўстанцкіх песнях. Адначасова з песнямі ў народзе былі распаўсюджаны розныя формы інструментальнай музыкі: ваенныя або паляўнічыя сігналы, жалейкавыя найгрышы пастухоў, удары барабана, бубна, музыка, якая суправаджала танцы, шэсці. Натуральна, што свае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

песні і інструментальныя найгрышы народ удасканальвае і шліфуе на працягу стагоддзяў, перадаючы іх з пакалення ў пакаленне. Адсюль і вялікая мастацкая вартасць лепшых узораў народнай музыкі, якія не перастаюць нас здзіўляць сваёй класічнай дакладнасцю і высокай мудрасцю. Але музычны фальклор каштоўны не толькі як увасабленне высокіх ідэалаў і думак народа. У фальклоры мы знаходзім першавытокі нацыянальнай музычнай мовы, якой карыстаюцца кампазітары. Усё тое, што складае выразныя сродкі класічнай музыкі, — інтанацыя, рытмы, ладавы строй, агульнапрынятыя формы і спецыфічная гукавая палітра — усё гэта ў той або іншай ступені бярэ пачатак у народзе.

Звернемся да такой формы музіцыравання, як хор. Яна створана народам у вельмі старажытныя часы. З фальклорнай практыкі харавая традыцыя была перанесена ў прафесійную музыку (оперу, араторыю і іншыя жанры). Тое ж можна сказаць і аб сімфанічным аркестры - гэтым складаным сугуччы інструментаў. Здаецца, маляўнічая палітра сучаснага аркестра не мае нічога агульнага са скромным самаробным вясковым інструментарыем. Аднак нават сама ідэя сімфанічнага ансамбля, які спалучае розныя віды струнных, духавых і ўдарных інструментаў, спачатку ўзнікла ў быце народа. І зараз яшчэ можна сустрэць у Чэхіі, на Украіне, у рэспубліках Закаўказзя народныя ансамблі, якія аб'ядноўваюць інструменты розных відаў. Па сутнасці, гэта своеасаблівыя прататыпы сімфанічнага аркестра. Наогул, кожны з сучасных інструментаў аркестра мае сваіх продкаў у традыцыйным народным інструментарыі. З пастуховых ражкоў і дудак нарадзіліся габой і кларнет. Старадаўнія гуслі былі папярэднікамі сучаснай арфы. Любы сродак музычнай выразнасці, якім карыстаецца кампазітар (няхай гэта мелодыя і рытм, гармонія і паліфанія), спачатку існаваў у народнапесеннай практыцы. У мастацтве народа ўзніклі і пэўныя віды сугуччаў, уласцівыя той або іншай нацыянальнай культуры, і розныя формы шматгалосся, і характэрныя рытмы танцаў, напрыклад нямецкага вальса, польскай мазуркі, іспанскага балеро. Музычныя элементы народнай песні

і танца і ўтварылі тую нацыянальную мову, якая адрознівае рускую музыку ад французскай, беларускую ад італьянскай, нямецкай. Сувязь з фальклорам, залежнасць ад канкрэтных народных вытокаў складаюць адну з важнейшых праяў нацыянальнага стылю ў музыцы.

Кожная нацыянальная культура мае свой асаблівы свет вобразаў, ідэй, эмоцый, сваё кола інтанацый, фарбаў, створаных практыкай народнага музіцыравання. Ва ўсёй гісторыі музыкі не было ніводнага выдатнага кампазітара, які б не звяртаўся ў той ці іншай меры да народнапесенных вытокаў. Нават самыя геніяльныя, тыя, каго мы лічым першаадкрывальнікамі, заснавальнікамі цэлых творчых накірункаў, былі, па сутнасці, запявалаамі. Яны распрацоўвалі і абагульнялі інтанацыйнае багацце, назапашанае жывой музычнай практыкай. Кампазітары, якія выкарыстоўвалі каштоўнасці народнага мастацтва, вярталі іх народу ва ўзбагачаным выглядзе.

Своеасаблівасць нацыянальнага стылю кампазітараў не абмяжоўваецца толькі запазычанасцю народнапесенных мелодый або іх вольным творчым увасабленнем. Вялікую ролю адыгрывае тут уздзеянне самых разнастайных відаў нацыянальнай культуры. Гэта і народны эпас, розныя жанры тэатральнага мастацтва, паэзіі, народных танцаў і г.д.

Не абмяжоўваючыся ўзнаўленнем народнапесенных мелодый, кампазітары ў сваіх творах імкнуліся перадаць і спецыфічныя асаблівасці народнай мовы, яе характэрныя размоўныя інтанацыі.

Вялікі ўплыў на фарміраванне нацыянальных музычных стыляў зрабіла паэзія. Ствараючы музычныя творы на вершы вялікіх паэтаў, кампазітары натхняліся прыгажосцю і своеасаблівасцямі нацыянальнага вершаскладання, а галоўнае - глыбінёй зместу, у якім увасоблены мудрасць, талент цэлага народа.

Такім чынам, у класічнай музыцы перапляліся плыні розных сфер народнага мастацтва, усёй нацыянальнай культуры. Гэта ў сваю чаргу садзейнічала найбольш шматграннаму адлюстраванню рэальнага жыцця ў музычным мастацтве.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ